*А. А. Жэлуновіч*

# СУЧАСНЫ ПАДРУЧНІК ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў ЛЮСТЭРКУ РЭФОРМЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Значэнне мовы ў жыцці кожнага чалавека цяжка перааацаніць. У ёй, як і ў грамадстве, існуюць свае законы – нормы. Засваенне літаратурнай нормы роднай мовы – асноўная мэта працэсу навучання як вучняў агульнаадукацыйных школ, так і студэнтаў ВНУ. А галоўнай крыніцай рэалізацыі гэтай мэты з'яўляецца падручнік.

Менавіта падручнік адлюстроўвае правілы літаратурнага вымаўлення і правапісу, «якія з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх карыстальнікаў беларускай мовы, служаць неад'емным фактарам іх культуры маўлення і агульнай культуры ўвогуле» [3, с.5]. А разнастайныя адхіленні ад нормаў множаць моўныя памылкі і цяжкасці яе правільнага ўжывання. Зыходзячы з выказвання М. Уэста, «мова не той прадмет, якому *можна* навучыцца, а той, якому *трэба* навучыцца» [8].

Сучасны падручнік па беларускай мове, на наш погляд, мае наступныя недахопы: па-першае, непаўната і варыянтнасць асвятлення існуючых правілаў мовы; па-другое, адсутнасць камунікатыўна накіраванага навучання мове.

Праілюструем першы аспект праблемы на разглядзе правіла каардынацыі дзейніка і выказніка ў трох групах падручнікаў: для студэнтаў ВНУ [5; 6], для вучняў агульнаадукацыйных школ [1; 2] і для абітурыентаў [4; 8].

Так, па выніках цэнтралізаванага тэсціравання за 2006 г. толькі 13% вучняў ад усіх выканалі вышэйназванае заданне правільна.

Паўната разгляду правілаў і пазіцыя аўтараў падручнікаў па вызначаных мадэлях каардынацыі дзейніка і выказніка ў ліку і родзе прадстаўлены ў наступнай табліцы:

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

| Структурна-граматычныя мадэлі каардынацыі дзейніка і выказніка | Пазіцыя аўтараў падручнікаў | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Сямешка, Шкраба, Бадзевіч | Грыгор'ева | Сіўковіч | Цыбульская | 9-ы клас | 11-ы клас |
| 1. Няпэўна-колькасныя словы *(многа, мала, некалькі, шмат, няшмат, багата і інш.)* + назоўн. Напр.: *З маленства ў сэрца мне* ***запала нямала*** *мудрых* ***слоў****...(Пр.)* У форме множнага ліку **дапускаецца** ўжыванне выказніка тады, калі назоўнік абазначае **асоб**: ***Некалькі жанчын завіхаліся*** *ў дзедавай хаце (Лыньк.)* | **А\М** | **А\М** | **А** | **А\М** | **А\М** | **А\М** |
| 2. *Большасць, меншасць, рад, частка, шэраг, мноства + наз.* Напр.: *Большасць дэпутатаў* ***прагаласавала (прагаласавалі)***. ***Большасць слоў засталася*** непачутай | **А\М** | **--** | **А** | **А\М** | **А** | **А\М** |
| 3. Зборны лічэбнік, *дзесятак, сотня, процьма, безліч, тысяча, мільён, мільярд+назоўнік.* Напр.: *Двое чалавек* ***сядзела*** *на возе (К.Ч.). Двое не* ***прыехала (прыехалі)***. *Аднекуль* ***наляцела*** *мільярд матылёў... (Лыньк.)* | **А** | **А\М** | **А\М** | **А** | **А** | **А\М** |
| 4. Прыблізная колькасць *(чалавек з дзесяць).* Напр.: *Чалавек з дзесяць* ***прыехала*** *музыкантаў* | **А** | **--** | **А** | **--** | **--** | **--** |
| 5. Лічэбнік + словы *месяцаў, тыдняў, гадоў, дзён, гадзін, вёснаў, мінут.* Напр.: *Семнаццаць гадоў* | **А** | **--** | **М** | **А** | **--** | **А\М** |

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ***прайшло** з таго часу. Пяць страшных год вайны **мінулі*** | | | | | | |
| 6. Назоўнік (займеннік) у форме назоўнага склону + назоўнік (займеннік) у форме творнага склону. Напр.: *Да поўначы **раіўся** Мікола з дзедам, як зрабіць справу (Лыньк.). Заслонаў з Міронам Іванавічам **правялі** кароткую нараду (Лыньк.)* | **А\М** | **А\М** | **М** | **А\М** | **А\М** | **А\М** |
| 7. Адмоўныя і няпэўныя займеннікі + субстантываваныя часціны мовы ва ўскосных склонах. Напр.: *Хтосьці з хлопцаў **ступіў** крок наперад...(Я.М.)* | **А** | **А** | -- | -- | -- | -- |
| 8. Колькасны лічэбнік + назоўнік. Напр.: *Пяць чалавек **сядзелі** каля агню. Дзевяноста шэсць гусіных горлаў **дзёрлася** на ўсю сілу. Заданне **выканалі** тры вучаніцы* | -- | **А\М** | **М** | **А\М** | **А\М** | **М** |
| 9. Складаны назоўнік з элементам ***паў***- Напр.: *Паўкніжкі **прачытана**. Паўгрупы **не прыйшлі** на сустрэчу* | -- | -- | -- | -- | -- | **А\М** |
| 10. Аднародныя дзейнікі. Напр.: *Па хаце **пабеглі** гаворка і смех. **Стаяў** шум, крыкі, лаянка* | -- | -- | -- | **А\М** | -- | -- |
| **Колькасць занятых пазіцый** | **7** | **5** | **7** | **7** | **5** | **7** |

*Умоўныя скарачэнні: М* – множны лік выказніка; *А* – адзіночны лік выказніка; -- – няма правіла.

Такім чынам, па-першае, з 10 вызначаных пазіцый ніводзін падручнік не разглядае ў поўным аб'ёме існуючыя мадэлі; па-другое, назіраецца варыятыўнасць тлумачэнняў гэтых мадэляў (гл. пазіцыі 1, 2, 3, 4, 5, 6, 8); па-трэцяе, паміж аўтарамі адной групы падручнікаў, напрыклад, для абітурыентаў [4; 8], высветлілася

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

выразная супярэчлівасць сцвярджэнняў (гл. пазіцыі 1, 2, 3, 5, 6, 8).

Як вядома, граматычныя сувязі і адносіны, якія вызначаюць структурную аснову любога сказа, з'яўляюцца вельмі важнымі для разумення выказвання. Неабходны яны і пры пабудове маўлення, для здзяйснення шырокай камунікатыўнай дзейнасці. Калі чалавек хоча выказаць думку, то ён выбірае для яго мэты структуру сказа, вылучае агульную «граматыку выказвання», напаўняючы яе словамі ў адпаведнасці з правіламі мовы. Асэнсаванне граматычных з'яў, сувязей, фарміраванне лінгвістычнай пісьменнасці (ці, як яшчэ кажуць, «лінгвістычнай кампетэнцыі») – абавязковая ўмова валодання мовай. А мэта вывучэння граматыкі – не ў пераказе правілаў, а ў тым, каб навучэнец правільна ўжываў іх, што адпавядае агульнай установоўцы навучання – не веды самі па сабе, а дзеянні на падставе атрыманых ведаў.

І паколькі аб'ём матэрыялу вызначаецца канкрэтнымі ўмовамі навучання (для вучняў, абітурыентаў, студэнтаў), моўныя правілы ў сучасным падручніку павінны быць *дакладнымі, дастатковымі і неабходнымі,* каб даць магчымасць навучэнцам розных узроўняў рэалізаваць атрыманыя веды ў адпаведнасці з іх прафесійнымі інтарэсамі. Магчыма, камісіі па рэфармаванні беларускай мовы трэба аднесці ў актыў даследаванняў удасканаленне апісання названых моўных мадэляў у мэтах забеспячэння непарыўнага адзінства мовы і маўлення ў працэсе навучання.

---


1. *Беларуская* мова: вучэб. дапам. для 9-га кл. устаноў, якія забяспечваюць атрыманне агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай і рускай мовамі навучання з 12-гад. тэрмінам навучання / Л. А. Антанюк [і інш.]. – 2-е выд. – Мн.: НІА, 2005. – 328 с.

2. *Гваздовіч, Г. А.* Беларуская мова: вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. шк. з бел. мовай навучання / Г. А. Гваздовіч, М. М. Круталевіч, У. П. Саўко. – Мн.: Нар. асвета, 2000. – 191 с.

3. *Плотнікаў, Б. А.* Слоўнік цяжкасцяў беларускай мовы / Б. А. Плотнікаў, В. П. Трайкоўская. – Мн.: Кніжны Дом, 2004. – 544 с.

4. *Сіўковіч, В. М.* Беларуская мова ў пытаннях, адказах і практыкаваннях / В. М. Сіўковіч. – Мн.: УніверсалПрэс, 2004. – 560 с. – (Сер. «Рыхтуемся да тэсціравання і экзаменаў»).

5. *Сучасная* беларуская мова: вучэб. дапам. / Л. М. Грыгор'ева [і інш.]; пад агульн. рэд. Л. М. Грыгор'евай. – Мн.: Выш. шк., 2006. – 559 с.


БИБЛИОТЕКА БГУКИ

6. *Сямешка, Л. І.* Курс беларускай мовы: падручнік / Л. І. Сямешка, І. Р. Шкраба, З. І. Бадзевіч. – Мн.: Універсітэцкае, 1996. – 654 с.

7. *Уэст, М.* Обучение английскому языку в трудных условиях / М. Уэст. – М., 1966. – С. 15.

8. *Цыбульская, С. І.* Беларуская мова: інтэнсіўны курс падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання і экзамену / С. І. Цыбульская. – 4-е выд. – Мн.: ТэтраСістэмс, 2006. – 336 с.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ